# Край велічы і хараства

**А. Н. АКСЁНАЎ,**
**першы сакратар Віцебскага абкома КП Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР**

Уявіце неабдымны казачны дыван з маляўнічых лясоў і дуброў, бяскрайніх азёр, раўнін і ўзгоркаў, прарэзаных блакітнымі стужкамі Заходняй Дзвіны і Дняпра, Обалі і Лучосы, Дзісны і Ушачы. Гэта і ёсць Віцебшчына — край дзівоснай прыгажосці, палымяных і мужных людзей, працоўнай і ратнай доблесці. Блакітнымі вачыма азёр углядаецца ён у роднае неба — мірнае і спакойнае. Тут кожная жменя зямлі можа расказаць аб шматвяковай гераічнай гісторыі нашага роднага Прыдзвіння. Віцебшчына, размешчаная на найкарацейшых шляхах ад Прыбалтыкі да Чорнага мора, на дарогах, што пралеглі ў цэнтр краіны і ў Заходнюю Еўропу, не раз была арэнай жорсткіх бітваў з іншаземнымі захопнікамі.



Не здарма на старадаўнім гербе віцяблян намаляваны воін на кані з кап'ём і шчытом у руках. Віцебскія палкі прымалі актыўны ўдзел у разгроме Тэўтонскага ордэна пад Грунвальдам у 1410 годзе. Продкі віцяблян былі ўдзельнікамі гераічных паходаў Аляксандра Неўскага, Пятра І, Аляксандра Суворава і Міхаіла Кутузава. Трапна сказаў аб родным краі наш зямляк паэт Генадзь Бураўкін:

Тут пад кожным курганам
і каменем
Ці быліна, ці казка чароўная.

Але край, надзелены прыродай казачным хараством, доўгія вякі заставаўся краем галечы і невуцтва, краем горкага лёсу людзей. Да Кастрычніка Віцебская губерня была адной з самых закінутых паўкаланіяльных ускраін царскай Расіі. На ўсёй тэрыторыі губерні налічваліся толькі дзесяткі дробных паўсаматужных майстэрань, дзе кавалі лапаты, сякеры, косы, сярпы, гнулі падковы. У гаротным становішчы знаходзілася вёска. На кожны сялянскі двор прыпадаў зямельны надзел меншы дзесяціны, затое 713 памешчыкаў мелі ў сваім распараджэнні 1,8 мільёна дзесяцін лепшых зямель. Тысячы сялян, змардаваныя голадам, адпраўляліся ў белы свет у пошуках працы і кавалка хлеба.

Марудна развіваліся культура, асвета, медыцына. Ва ўсёй губерні на 160 чалавек жыхароў прыходзіўся ўсяго адзін пісьменны, а на 100 тысяч насельніцтва — адзін лекар. Губерня не мела ні адной вышэйшай навучальнай установы.

Матэрыяльныя нястачы, беспрасветная цемра, якія былі пастаяннымі спадарожнікамі працоўнага люду, дапаўняліся яго палітычнай бяспраўнасцю. Але ўсё мацней нарастаў народны гнеў, глыбей авалодвалі розумам рабочых, сялян, перадавой інтэлігенцыі марксісцка-ленінскія ідэі. Партыя бальшавікоў вяла віцяблян, як і ўвесь рэвалюцыйны народ, на штурм друзлых асноў царызму. Дзякуючы ёй, вялікай партыі Леніна, святлом Кастрычніка азарылася старажытная зямля Віцебшчыны.

З бязмерным рэвалюцыйным энтузіязмам і доблесцю працоўныя вобласці пачалі будаваць новае жыццё. Яны аддана верылі ў тое, што сацыялізм, аб якім марылі перадавыя людзі на чале з Леніным, будзе пабудаваны. Адсюль, з берагоў Дзвіны і Дняпра, ад сцен старажытнага Полацка, з многіх паветаў і вёсак у Маскву, у Крэмль, ішлі іх шматлікія пасланні, тэлеграмы і рапарты Ільічу. І заўсёды працоўныя атрымлівалі ад любімага правадыра сяброўскія парады і гарачую падтрымку.

Выконваючы ленінскія запаветы, людзі працы смела перайначвалі жыццё, змянялі воблік зямлі. Ужо ў гады першай пяцігодкі ў пейзажы яе ўпісаны карпусы Віцебскай фабрыкі «КІМ», Аршанскага (цяпер ордэна Леніна) льнокамбіната, БелДРЭСА, «Асінторфа», станкабудаўнічых заводаў — дзесяткаў прадпрыемстваў, якіяператварылі Наддзвінне ў індустрыяльны край рэспублікі.

Сяляне, атрымаўшы ад Савецкай улады зямлю, павялі наступленне на кулака, распачалі змаганне за перабудову вёскі на сацыялістычны лад. Так, у Лёзненскім раёне ўзнікла першая ў Беларусі сельскагаспадарчая камуна, з якой потым вырас калгас «Першае Мая». Нядаўна ён урачыста адзначыў сваё слаўнае саракагоддзе.

На Віцебшчыне была створана і першая ў рэспубліцы камсамольская ячэйка. Віцебскія работніцы фабрыкі «КІМ» сталі пачынальнікамі ўсебеларускага руху ўдарнікаў і шматстаночнікаў.

Вераломны напад на нашу краіну гітлераўскай Германіі прыпыніў стваральную працу савецкіх людзей. Вайна ўварвалася ў кожны дом і кожную савецкую сям'ю. Віцебская вобласць, як уся рэспубліка і ўся краіна, з першых дзён вайны ўзнялася для адпору ворагу. У нашым Прыдзвінскім краі было створана 35 партызанскіх брыгад. На кожным метры зямлі ворага падпільноўвалі гнеў і помста народа. Партызаны Віцебшчыны знішчылі больш 100 тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў, пусцілі пад адхон тысячы воінскіх эшалонаў, разбурылі каля тысячы кіламетраў чыгуначных і шасэйных дарог.

Арганізатарамі і кіраўнікамі ўсенароднага партызанскага руху, яго светачам і душою былі камуністы. У суровых баях з ворагам таленавітымі партызанскімі камандзірамі праявілі сябе К. С. Заслонаў, М. П. Шмыроў (Бацька Мінай), П. М. Машэраў, А. Ф. Данукалаў, У. Е. Лабанок, М. Ф. Бірулін, Д. Ф. Райцаў, Н. С. Прудпікаў, І. К. Захараў, Д. В. Цябут і многія іншыя.

Нязгасная славай авеяны доблесныя справы ўдзельнікаў Віцебскага партыйна-камсамольскага падполля. Адным з кіраўнікоў яго была слаўная дачка беларускага народа Вера Захараўна Харужая. Шырокую вядомасць набылі таксама подзвігі маладагвардзейцаў Обалі і «Асінторфа», падпольшчыкаў Оршы, Полацка, Лепеля, Лёзны, Суража, Расон.

Родны край свой праславілі тысячы воінаў-віцяблян, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Медсястра палачанка Зінаіда Туснолобава-Марчанка здзейсніла свой гераічны подзвіг на полі бою пад Масквой. На чале абароны Брэсцкай крэпасці быў наш зямляк палкавы камісар Яфім Фамін. У бітве на Курскай дузе абяссмерціў сваё імя выхаванец віцебскай камсамоліі А. К. Гаравец, які ў адным баі знішчыў 9 фашысцкіх сцярвятнікаў. Працоўныя вобласці свята захоўваюць



Віцебшчына дае краіне вадкае паліва. На адной з установак Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода, якая вырабляе бензін, паспяхова працуе памочнік аператара камсамолка Людміла Карагіна.

Фота М. Мінковіча.

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы